# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК 908(476)(043.3)

## ДЗЕЙНАСЦЬ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ТАВАРЫСТВАЎ У ГАЛІНЕ ПАДАРОЖЖАЎ І ТУРЫЗМУ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 ГГ.

***У.А. ГАНСКІ***
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Наваполацк, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Міжваенны перыяд у гісторыі развіцця турыстычнага руху мае асаблівае значэнне, бо менавіта тады пачалося станаўленне турызму на беларускіх землях як асобнай галіны гаспадаркі. Акрамя таго, у гэты перыяд турыстычная справа перайшла пад падпарадкаванне дзяржаўных органаў улады, што прывяло да ўзнікнення новых устаноў, якія займаліся яе апекай і кантролем. Улады ІІ Рэчы Паспалітай, у склад якой па ўмовах Рыжскага дагавора 1921 г. у гэты перыяд уваходзілі заходнебеларускія землі, ажыццяўлялі разнастайныя меры для выхавання ў насельніцтва Заходняй Беларусі польскага патрыятызму, насаджэння думкі аб тым, што Заходняя Беларусь з'яўляецца складовай часткай Польшчы. Для гэтага выкарыстоўваліся розныя метады. Адным з іх і быў турызм. Менавіта таму развіццю турыстычнага руху, перш за ўсе на далучаных тэрыторыях, эліты ІІ Рэчы Паспалітай надавалі асаблівую ўвагу. Пасля здабыцця Беларуссю незалежнасці пачаўся працэс зняцця ідэалагічных абмежаванняў і адкрыцця доступу да шэрагу архіўных фондаў, павялічыліся магчымасці азнаямлення з творчасцю польскіх навукоўцаў, зацікаўленасць беларускіх даследчыкаў гісторыяй міжваеннага часу. Перш за ўсе, у цэнтры ўвагі навукоўцаў апынуліся пытанні палітычнай гісторыі. У той жа час належнай увагі праблемам зараджэння і развіцця турыстычнага руху не надавалася. Зыходзячы з гэтага і наяўнасці шматлікіх зыходных неапрацаваных інфармацыйных комплексаў па гэтай праблематыцы, даследаванне гісторыі развіцця турызму ў Заходняй Беларусі набывае навуковую актуальнасць. Асаблівую цікавасць выклікае дзейнасць разнастайных польскіх арганізацый і аб'яднанняў у сферы папулярызацыі турыстычнага руху, а таксама ўдзел у ім органаў дзяржаўнай адміністрацыі.

**Асноўная частка.** Турыстычныя таварыствы і арганізацыі, якія спрычыніліся да развіцця падарожжаў і турызму на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенныя гады, магчыма падзяліць на дзве групы: агульнадзяржаўныя, цэнтральныя органы якіх знаходзіліся ў Варшаве, і якія мелі свае філіялы ці аддзяленні ў гарадах Заходняй Беларусі; рэгіянальныя, непасрэдна заснаваныя і дзейнічаўшыя на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў. Да першай групы адносяцца Таварыства развіцця Усходніх зямель, Польскае краязнаўчае таварыства, Яўрэйскае краязнаўчае таварыства, Польскі турыстычны клуб, Польскі аўтамабільны клуб, Саюз польскіх турыстычных таварыстваў і Працоўнае турыстычнае таварыства; да рэгіянальных – Віленскае краязнаўчае таварытсва і Таварыства сябраў навук у Вільні. Неабходна адзначыць, што да пачатку 1920–х гг. на землях Заходняй Беларусі не існавала ніводнага турыстычнага таварыства ці арганізацыі [1, с. 387], усе яны ўзніклі пасля 1921 г., гэта значыць ужо пасля далучэння гэтага рэгёну да ІІ Рэчы Паспалітай.

Характарызуючы агульнадзяржаўныя таварыствы ІІ Рэчы Паспалітай, якія ў сваёй дзейнасці спрычыніліся да развіцця падарожжаў і турызму, неабходна адзначыць, што іх дзейнасць у асноўным была скіравана на развіццё турызму ва ўсёй дзяржаве ўвогуле без акцэнту на асобныя рэгіёны.

Найбольшы ўклад у развіццё турыстычнага руху на землях Заходняй Беларусі сярод агульнадзяржаўных арганізацый і таварыстваў унесла Таварыства развіцця Усходніх зямель, якое было ўтворана 11 лістапада 1933 г. пад старшынствам маршалка сенату Аляксандра Прыстора. Па структуры гэтае таварыства падзялялася на акругі (супадалі з межамі ваяводстваў), якія ў сваю чаргу мелі свае аддзяленні (па паветах) [2, с. 2].

Мэтай дзейнасці Таварыства развіцця Усходніх зямель было спрыянне развіццю культуры, навукі, гаспадаркі на ўсходніх землях ІІ Рэчы Паспалітай. І галоўным сродкам гэтага меў стаць менавіта турызм. Гэтае таварыства папулярызавала ўсходнія ваяводствы як перспектыўны турыстычны рэгіён. Яно выдавала брашуры, кнігі, штогоднікі, часопісы, газеты, у якіх месцілася ін-



Полесгу

фармацыя аб усходніх рэгіёнах II Рэчы Паспалітай, у тым ліку і аб Заходняй Беларусі. У іх увесь час луналі заклікі наведаць гэтыя землі [3, с. 239]. Яшчэ адным спосабам папулярызацыі даследуемых зямель як турыстычнага рэгіёну былі разнастайныя канцэрты, выставы, ярмаркі, якія арганізоўвала Таварыства развіцця Усходніх зямель пад лозунгамі «наведаць ваяводства паўночна–ўсходняй Польшчы» [2, с. 4].

Таварыства развіцця Усходніх зямель складалася з секцый. Адной з іх была турыстычная, утвораная ў 1934 г. Па чарзе ею кіравалі Т. Васунг [4, арк. 4], М. Венгрэцкі, С. Лорэнс і Я. Ракоўскі [5, с. 69]. З 1934 г. таварыства з мэтай павелічэння колькасці турыстаў, якія наведвалі ўсходнія ваяводствы II Рэчы Паспалітай, штогод праводзіла акцыю «Лета ва Усходніх землях». У межах гэтай акцыі пры супрацоўніцтве з Міністэрствам камунікацый Таварыства развіцця Усходніх зямель надавала турыстам, якія наведвалі гэты рэгіён, зніжкі да 75% на праезд чыгуначным транспартам па тэрыторыі Заходняй Беларусі [6, с. 223]. Акрамя згаданай акцыі таварыства выступала ініцыятарам і арганізатарам правядзення іншых акцый і імпрэз, выстаў і іншых мерапрыемстваў, якія праводзіліся з мэтай прыцягнення турыстаў ва ўсходнія рэгіёны краіны.

З усіх пералічаных агульнадзяржаўных таварыстваў і арганізацый першым па даце ўтварэння было Польскае краязнаўчае таварыства, якое было заснавана ў Варшаве яшчэ ў часы Расійскай імперыі, 5 снежня 1906 г. [7, с. 180]. Яно працягвае сваю дзейнасць і ў цяперашні час пад назвай Польскае турыстска–краязнаўчае таварыства. У даследуемы перыяд яно зрабіла значны ўнёсак у развіццё падарожжаў і турызму як на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў, так і па ўсей II Рэчы Паспалітай. Аднымі з галоўных задач дадзенага таварыства былі прапаганда падарожжаў і спрыянне развіццю турыстычнага руху, для чаго пры Польскім краязнаўчым таварыстве існавала турыстычная секцыя [8, с. 276].

На працягу міжваеннага перыяду Польскае краязнаўчае таварыства ўзначальваў Аляксандр Яноўскі [9, с. 98]. Да 1930 г. не мела філіялаў і аддзяленняў, паскольку гэта не прадугледжвалася ягоным статутам [10]. Пасля зменаў статуту пачынаюць масава ўтварацца рэгіянальныя аддзяленні ў Лідзе, Брэсце, Браславе, Баранавічах і інш. [11, с. 127].

Акружныя арганізацыйныя структуры Польскага краязнаўчага таварыства ажыццяўлялі функцыі нагляду і каардынацыі краязнаўчага і турыстычнага руху на тэрыторыі пэўнага ваяводства. Перыядычна праводзіліся з'езды, на якіх адбываліся справаздачы правінцыйных аддзяленняў, абмяркоўваліся праблемы і перспектывы развіцця, зацвярджаліся праграмы дзейнасці і інш.

Друкаваным органам Польскага краязнаўчага таварыства быў часопіс «Зямля», які выходзіў раз на два тыдні ў 1926–1932 гг. і раз на месяц у 1922–1925 гг. і 1932–1939 гг. У ім публікаваліся артыкулы на краязнаўчую і турыстычную тэматыку, у тым ліку месцілася значная колькасць публікацый з фотаздымкамі турыстычных аб'ектаў Заходняй Беларусі. Членам таварыства выдаваўся месячны бюлетэнь «Краязнаўчыя і турыстычныя ведамасці», у якім размяшчалася інфармацыя аб падзеях у галіне турызму і краязнаўства [12, с. 84].

Польскае краязнаўчае таварыства прымала актыўны ўдзел у выданні турыстычных даведнікаў, мапаў, буклетаў, улётак і інш.

Ад 1909 г. у Варшаве дзейнічаў Польскі аўтамабільны клуб. У 1921–1923 і 1928–1935 гг. яго кіраўніком быў Караль Рачынскі [13, с. 28], у 1923–1927 гг. – Станіслаў Гродскі, а з 1935 г. клуб узначальваў Юліян Пясэцкі. У сваёй структуры Клуб меў турыстычнае бюро, якое надавала турыстам інфармацыю аб стане дарог, месцах для начлегаў і харчавання, а таксама распрацоўвала па замовах аўтамабільныя турыстычныя маршруты [14, с. 196]. Узначальваў турыстычнае бюро Польскага аўтамабільнага клуба М. Рапэ. Акрамя ўласных рэгіянальных аддзяленняў, клуб аб'ядноўваў яшчэ некалькі згуртаванняў на правах асобных юрыдычных асоб, у тым ліку Віленскі аўтамабільны клуб, заснаваны ў 1928 г., і Палескі аўтамабільны клуб у Брэсце, заснаваны ў 1937 г. [13, с. 31].

Адной з буйнейшых турыстычных арганізацый II Рэчы Паспалітай быў Польскі турыстычны клуб, утвораны ў 1925 г. [15, с. 2]. Ініцыятарам утварэння гэтай турыстычнай арганізацыі было Міністэрства грамадскіх работ, а суарганізатарамі сталі Польскі аўтамабільны клуб, Польскае краязнаўчае таварыства і Польскае татранскае таварыства. Польскі турыстычны клуб быў утвораны з мэтай папулярызацыі польскага турызму як на тэрыторыі самой дзяржавы, так і па–за яе межамі, а таксама з мэтаю падтрымкі іншых турыстычных таварыстваў і арганізацый. Заснавальнікам і першым старшынёю гэтай турыстычнай арганізацыі быў Стэфан Пшэздзецкі [13, с. 32]. Польскі турыстычны клуб з 1925 г. быў афіцыйным прадстаўнікам краіны пры Міжнароднай цэнтральнай турыстычнай радзе у Парыжы, а ад 1926 г. таксама пры Міжнародным саюзе турызму у Брусэлі, а таксама на міжнародных турыстычных форумах. Членам клубу прадстаўляліся зніжкі ў пэўных



Полесгу

атэлях, рэстаранах, на станцыях тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў, а таксама дзейнічалі спецыяльныя кошты на замежныя падарожжы, арганізаваныя клубам [16, с. 12].

У канцы 1926 г. кіраўнік Дэпартамента турызму М. Арловіч выказаў думку аб стварэнні адзінай агульнадзяржаўнай турыстычнай арганізацыі, якая б аб’ядноўвала ўсе турыстычныя таварыствы і арганізацыі ІІ Рэчы Паспалітай. З гэтай мэтай Польскае турыстычнае таварыства ініцыявала правядзенне ІІ Турыстычнага з’езду, які адбыўся ў Варшаве 2–3 красавіка 1927 г. [17, с. 158]. На ім было прынята рашэнне аб стварэнні агульнадзяржаўнай турыстычнай арганізацыі пад назвай Саюз польскіх турыстычных таварыстваў са штаб–кватэрай у Варшаве [13, с. 5]. Праз 2 гады аналагічнае рашэнне было прынята на канферэнцыі па пытаннях турызму і краязнаўства, якая праходзіла 5 сакавіка 1929 г. у Варшаве [18, с. 107]. У яе склад увайшлі Польскае турыстычнае таварыства, Польскае краязнаўчае таварыства, Польскі турыстычны клуб і Польскі аўтамабільны клуб [13, с. 6]. Праз год да складу гэтай арганізацыі далучыўся Саюз польскіх курортаў і некалькі рэгіянальных таварыстваў гэтага кірунку. Кіруючым органам Саюзу польскіх турыстычных арганізацый быў арганізацыйны камітэт, які ўзначальваў С. Асецкі, у склад камітэта таксама ўвайшлі А. Яноўскі, М. Арловіч, А. Бабкоўскі, Ф. Дахоўскі, Р. Мінхеймер, К. Рачынскі і Ф. Шнарбачоўскі [17, с. 158–159]. Праіснавала гэтая турыстычная ўстанова да 1938 г. [19, с. 196]. Згодна са статутам дадзенай установы, галоўнымі задачамі арганізацыі былі прапаганда турыстычнага руху на тэрыторыі ІІ Рэчы Паспалітай, а таксама каардынацыя дзейнасці ўсіх турыстычных таварыстваў і арганізацый краіны [20, с. 100].

У міжваенны час на землях Заходняй Беларусі, як і па ўсёй дзяржаве, шматлікай была яўрэйская грамада. У 1926 г. у Варшаве прадстаўнікамі грамады было заснавана Яўрэйскае краязнаўчае таварыства на чале з М. Гіндэсам [13, с. 36]. Па сваёй структуры і арганізацыі Яўрэйскае краязнаўчае таварыства было падобным да Польскага краязнаўчага таварыства, галоўнаю ж адметнасцю было тое, што яно акцэнтавала сваю дзейнасць вакол помнікаў яўрэйскай культуры. У кожным з заходнебеларускіх ваяводстваў дзейнічалі аддзелы Яўрэйскага краязнаўчага таварыства колькасцю ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў членаў у кожным ваяводстве, буйнейшым з якіх быў Віленскі. Яўрэйскае краязнаўчае таварыства з 1930 г. выдавала месячнік «Ведамасці Я.К.Т.» [21]. У суботніх нумарах газеты «Наш погляд» таварыства выдавала брашуру «Турызм і краязнаўства» [13, с. 37].

На працягу 1935–1939 гг. у ІІ Рэчы паспалітай дзейнічала Працоўнае турыстычнае таварыства, якое займалася пашырэннем турыстычнага руху сярод працоўнага насельніцтва. Ягоны статут быў зацверджаны 8 студзеня 1935 г., хоць фактычна яно ўжо дзейнічала з канца 1934 г. Да 1937 г. яго ўзначальваў С. Грылёўскі, а з 1937 г. – К. Дамаслаўскі [22, с. 1]. Галоўнымі задачамі дадзенай арганізацыі было паказаць рабочым як можна выкарыстоўваць свой адпачынак. Для гэтага сярод рабочых распаўсюджваліся пуцёўкі ў санаторыі, на курорты, арганізоўваліся экскурсійныя паездкі і інш.

Значны ўклад у развіццё турыстычнай справы даследуемай тэрыторыі ўнеслі рэгіянальныя таварыствы – Віленскае краязнаўчае таварытсва і Таварыства сябраў навук у Вільні. Іх дзейнасць была выгаднай і зручнай для ўлад ІІ Рэчы Паспалітай, таму што менавіта дзякуючы ім вялася папулярызацыя і прапаганда польскай культуры, эфектыўным спосабам чаго і была турыстска–краязнаўчая работа. Яна ажыццяўлялася шляхам планавання і арганізацыі маршрутаў па «паўночна–ўсходнім крэсам», правядзення краязнаўчых экскурсій, падрыхтоўкі экскурсаводаў, кіравання ці ажыццяўлення апекі над дзейнасцю грамадскіх, асабліва моладзевых, краязнаўчых асяродкаў і інш. Мэтай усіх пералічаных мерапрыемстваў было выхаванне насельніцтва ў духу польскага патрыятызму, насаджэння ўяўленняў, што заходне беларускія землі з’яўляюцца спрадвечнай часткай польскай дзяржавы, увесь час лунаў заклік з боку польскага кіраўніцтва вывучаць «паўночна–ўсходнія крэсы» у гістарычным звязку з мінулым Рэчы Паспалітай [23, с. 151].

Дастаткова дыскусійным з’яўляецца пытанне адноста ўтварэння і назвы Віленскага краязнаўчага таварыства. Асобныя даследчыкі адзначаюць, што яно было ўтворана як аддзел Польскага краязнаўчага таварыства, у якасці аргументаў прыводзячы звесткі, што «на крэсах» аддзелы агульнадзяржаўнага Польскага краязгаўчага таварыства паўсталі у другой палове 1920–х – 1930–я гг. Але гэтае сцверджанне з’яўляецца памылковым, таму што ўтворана Віленскае краязнаўчае таварыства было як самастойнае аўтаномнае таварыства, і толькі ў 1928 г. змяніла назву на Віленскі аддзел Польскага краязнаўчага таварыства. Гэта пацвярджаецца і тым, што яшчэ з 1923 г. у Вільні ажыццяўлялася выданне турыстска–краязнаўчай літаратуры «Віленскім краязнаўчым таварыствам». У гэты ж час Польскае краязнаўчае таварыства ўжо існавала (паўстала ў 1906 г.), але да 1930 г. яно не мела рэгіянальных філіялаў і аддзяленняў, таму што гэта не прадугледжвалася яго-

ПолесГУ

ным дзейным статутам. Акрамя таго, на пачатку 1930–х гг. у склад Польскага краязнаўчага таварыства, якое ў гэты час сапраўды пераўтвараецца ў агульнадзяржаўнаю турыстска–краязнаўчую арганізацыю, уваходзяць ужо існуючыя аналагічныя незалежныя арганізацыі Кракава, Познані, Катовіц, Львову і іншых гарадоў тагачаснай Польшчы [24, с. 155]. Такім чынам, Віленскае краязнаўчае таварыства фактычна стала філіялам альбо аддзелам Польскага краязнаўчага таварыства, і менавіта з гэтага часу ў перыядычных выданнях і нават у дакументах паралельна ўжываецца две назвы гэтага таварыства – Віленскае краязнаўчае таварыства і Віленскі аддзел Польскага краязнаўчага таварыства [25, арк. 5–8]. Разам з тым, неабходна адзначыць, што істотных зменаў у арганізацыйнай структуры і напрамках дзейнасці пасля ўваходжання ў склад Польскага краязнаўчага таварыства не адбылося.

Віленскае краязнаўчае таварыства мела штаб–кватэру ў Вільні і мясцовыя павятовыя філіялы ў буйнейшых гарадах ваяводства. Пры іх на аснове статуту і пад кіраўніцтвам аднаго з членаў мясцовага праўлення дзейнічалі моладзевыя асяродкі, якія займаліся пашырэннем турыстска–краязнаўчага руху сярод моладзі. Члены Віленскага краязнаўчага таварыства аб'ядноўваліся ў наступныя секцыі: турыстычная, краязнаўчая, прыродаахоўная, музейная і інш. Яны ўтвараліся са згоды ваяродскай рады, павінны былі кіравацца прынцыпамі і палажэннямі яго статуту, падаваць ваяводскай радзе інфармацыю аб колькасці членаў, гадавыя справаздачы аб сваёй дзейнасці і інш.

Для падтрымкі сувязяў з усімі сваімі асяродкамі азначанае таварыства праводзіла штогадовыя і паўгадавыя з'езды дэлегатаў гэтых асяродкаў. На іх звычайна сцвярджалі праграму дзейнасці таварыства, абмяркоўвалі і зацвярджалі справаздачы за папярэдні год, зацвярджалі гадавы бюджэт, абмяркоўвалі метады папулярызацыі турыстска–краязнаўчага руху ў рэгіёне і інш. На з'ездах таксама прыймалі ў ганаровыя члены таварыства.

Акрамя таго, Віленскае краязнаўчае таварыства займалася планаваннем і арганізацыяй разнастайных турыстычных маршрутаў, унутрырэгіянальных і міжнародных вандровак, а таксама было арганізатарам курсаў у галіне турызму, праводзіла з'езды, канферэнцыі, на якіх разглядаліся пытанні развіцця і прапаганды турызму ў даследуемым рэгіёне.

Варта адзначыць, што падчас экскурсій, якія арганізоўвала таварыства, было зроблена шмат фотаздымкаў з краявідамі Віленшчыны. На працягу 1928–1930 гг. члены таварыства перадалі Галоўнай радзе Польскага краязнаўчага таварыства копіі ўсіх фотаздымкаў, якія знаходзіліся ў бібліятэцы таварыства. Згодна з мэтай папулярызацыі краю, усе яны былі прадстаўлены на турыстычных выставах і ярмарках. У 1937–1938 гг. таварыства частку сабраных фотаздымкаў з краявідамі рэгіёну перадало згуртаванню, якое займалася развіццём турыстычнага руху пры Ягелонскім універсітэце ў Кракаве [26, с. 210]. Так, у 1937 г. было перададзена 57 фотаздымкаў, у 1938 г. – 55 [27, с. 18].

Таварыства супрацоўнічала з рознымі турыстычнымі бюро з іншых рэгіёнаў краіны. Найольш плённым было супрацоўніцтва з турыстычнымі бюро «Орбіс» і «Францпол». Сумеснымі намаганнямі яны арганізоўвалі падарожжы за мяжу. Напрыклад, у 1930 г. было здзейснена чатырохтыднёвае падарожжа, падчас якога былі наведаны Сербія, Боснія і Герцагавіна, Чарнагорыя, Далмацыя і Альпы. Удзел у акцыі прынялі 30 асоб. Кошт падарожжа склаў 750 злотых з чалавека.

Турыстам таксама прапаноўвалася здзейсніць за 325 злотых дзесядзённае турыстычнае падарожжа ў Рыгу, Талін і Гельсінгфорс, а таксама для жыхароў Віленскага ваяводства арганізоўваліся туры ў Венецыю, Фларэнцыю, Рым, Кракаў, у гарады Грэцыі і Югаславіі.

Члены Віленскага краязнаўчага таварыства прымалі ўдзел у разнастайных агульнадзяржаўных і рэгіянальных з'ездах, якія былі прысвечаны пытанням развіцця турыстычнай галіны. Напрыклад, у агульнапольскім з'ездзе падтрымкі развіцця турызму і турыстычнай дзейнасці (17 сакавіка 1931 г., Варшава), з'ездзе рэферэнтаў турызму (2–3 ліпеня 1931 г., Тарнапаль), агульных з'ездах аддзелаў Польскага краязнаўчага таварыства ў Роўна і Сарнах. Прадстаўнікі Віленскага краязнаўчага таварыства таксама прымалі ўдзел у канферэнцыі па пытаннях навучання платных экскурсаводаў, якая адбылася 13 снежня 1931 г. у Варшаве. У наступныя гады члены таварыства ўжо самі арганізоўвалі такія курсы ў Вільні. У выніку навучання і складання экзаменаў, слухачы атрымоўвалі дыпломы экскурсаводаў I і II ступеняў. Апошнія такія заняткі былі праведзеныя вясною 1939 г. Адной з формаў папулярызацыі турыстычнага руху было правядзенне выстаў. Згаданае таварыства зрабіла значны ўнёсак у іх арганізацыю. Віленскае краязнаўчае таварыства таксама займалася выданнем турыстычных даведнікаў, буклетаў, усётак, турыстычных мапаў і інш.

Яшчэ адным таварыствам, якое ўнесла прыкметны ўклад у развіццё і папулярызацыю турызму на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час, было Таварыства сябраў навук у Вільні. Утворана яно было яшчэ ў 1906 г. па ініцыятыве Альфонса Парчэўскага. Дзейнасць таварыства мела на



Полесгу

мэце развіццё рэгіянальных даследаванняў (вывучэнне краю з пункту гледжання гісторыі, этнаграфіі, прыродазнаўства, статыстыкі і інш.) З 1907 г. таварыства выдавала «Штогоднік Таварыства сябраў навук у Вільні», а з 1923 г. ІІІ аддзел таварыства выдаваў часопіс «Ateneum Wileńskie». З 1919 г. аднавіў дзейнасць Універсітэт імя Стэфана Баторыя, з якім таварыства актыўна супрацоўнічала на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў. Старшынямі таварыства па чарзе былі Ян Курчэўскі, Уладыслаў Загорскі, Альфонс Парчэўскі, Мар’ян Здзяхоўскі і Станіслаў Касцялкоўскі. Сярод сяброў таварыства былі Эліза Ажэшка, Тадэуш Цыжоўскі, Людвіг Каланкоўскі, Юзаф Монтвіл, Максіміліян Росэ, Браніслаў Урублеўскі і інш. [28].

Таварыства сябраў навук у Вільні было ўтворана з мэтай арганізацыі і каардынацыі працы існуючых у рэгіёне навуковых устаноў. Аналізуючы матэрыялы архіваў і перыядычнага друку, іншыя крыніцы, можна убачыць, што дзейнасць гэтага таварыства засяроджвалася на наступных асноўных напрамках: пошук і збор гістарычных (арэалагічных, этнаграфічных, археаграфічных і інш.) помнікаў, іх вывучэнне, сістэматызацыя і апісанне; ахова прадметаў даўніны; папулярызацыя гісторыі і старажытнасцей праз турыстычную дзейнасць, арганізацыю краязнаўчых выстаў, супрацоўніцтва з маладым пакаленнем у правядзенні турыстска–краязнаўчай работы. Як ужо згадвалася, польскія ўлады актыўна прапагандавалі думку аб тым, што заходнебеларускія землі з’яўляюцца гістарычна польскімі. Для падтрымкі гэтай думкі Таварыства сябраў навук у Вільні ставіла перад сабою наступныя заданні: папулярызацыя ў краі гісторыка–краязнаўчых даследаванняў, апрацаванне невядомых архіўных збораў, арганізацыя выдаўнічай справы, правядзенне навуковых паседжанняў, збор матэрыялаў для польскіх музеяў, ажыццяўленне навуковай падтрымкі даследчыкаў і інш.

Для паглыбленага вывучэння краю Таварыства сябраў навук у Вільні усталявала і падтрымлівала шчыльныя навуковыя кантакты з Акадэміяй мастацтваў, Дзяржаўным архівам, Саюзам музеяў, Таварыствам развіцця ўсходніх зямель у Варшаве, Нумізматычна–археалагічным таварыствам у Кракаве і іншымі навуковымі і грамадскімі аб’яднаннямі і ўстановамі краіны.

Таварыства сябраў навук у Вільні, як і Віленскае краязнаўчае таварыства, прымала ўдзел у арганізацыі разнастайных экскурсій. Абодва таварыствы праводзілі экскурсіі ў асноўным сярод моладзі з наведваннем помнікаў гісторыі і архітэктуры. Асаблівасцю экскурсій было тое, што яны ахоплівалі тэтыторыю не толькі Віленскага ваяводства, а і ўсей Заходняй Беларусі і сумежных тэтыторый ІІ Рэчы Паспалітай.

**Заключэнне.** Такім чынам, разгледзіўшы дзейнасць грамадскіх арганізацый і таварыстваў у галіне падарожжаў і турызму, можна зрабіць выснову, што яны зрабілі значны ўнёсак у развіццё турыстычнай справы як на тэрыторыі ІІ Рэчы Паспалітай увогуле, так і на землях Заходняй Беларусі ў прыватнасці. Усе таварыствы можна падзяліць на дзве групы: агульнадзяржаўныя, цэнтральныя выканаўчыя органы якіх знаходзіліся ў Варшаве і якія мелі свае філіялы, аддзелы і прадстаўніцтвы ў гарадах Заходняй Беларусі, і рэгіянальныя, гэта значыць тыя, якія непасрэдна былі заснаваныя і дзейнічалі на тэрыторыі заходне беларускіх ваяводстваў. Сярод агульнадзяржаўных найбольш плённаю ў галіне падарожжаў і турызму была дзейнасць утворанага ў 1933 г. Таварыства развіцця Усходніх зямель. Акрамя яго, значны ўклад у развіццё турызму на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўнеслі Польскае краязнаўчае таварыства, Польскі турыстычны клуб, Яўрэйскае краязнаўчае таварытсва, Польскі аўтамабільны клуб і Працоўнае турыстычнае таварыства. Аднак вядучая роля ў справе папулярызацыі турыстычнага руху належыць рэгіянальным таварыствам – Віленскаму краязнаўчаму таварыству і Таварыству сяброў навук у Вільні. Гэтыя таварыствы займаліся распрацоўкай і арганізацыей турыстычных маршрутаў па краю, праводзілі краязнаўчыя экскурсіі, рыхтавалі экскурсаводаў, апякалі грамадскія, асабліва моладзевыя, краязнаўчыя і турыстычныя згуртаванні і інш. Але пры гэтым галоўнаю мэтаю дзейнасці амаль ўсіх згаданых арганізацый і таварыстваў было выхаванне насельніцтва краю ў духу польскага патрыятызму, укараненне і пашырэнне меркавання аб тым, што заходне беларускія землі спрадвеку з’яўляюцца неад’емнай часткай тэрыторыі польскай дзяржавы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Janowski, A. Sprawozdanie z działalności / A. Janowski // Ziemia. – 1926. – №23–24. – S. 385–392.
2. Statut Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich. – Warszawa : Nakladem Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich, 1938. – 16 s.
3. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Cz. VI. – Sygn. 107. Turystyka – administracja, 409 s.


ПолесГУ

4. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespol 88/16 Zbior zespolów szczątkowzch. Towarzystwo Rozwoju Ziem Wschodnich. – Sygn. 66. Biuletetyny Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich, 62 s.

5. Kacprzak, M. Towarzystwo Rozwoju Ziem Wschodnich, 1933–1939 / M. Kacprzak. – Łódź: Wudawnictwo Naukowe «Ibidem», 2005. – 158 s.

6. Rocznik Ziem Wschodnich / pod. red. E. Ruhlego. – Warszawa: Wudawnictwo zarządu głównego Tow. Rozwoju Ziem Wschodnich, 1938, – 265 s.

7. Janowski, A. Polskie Towarzystwo Krajoznawcze / A. Janowski // Ziemia. – 1927. – №11. – S. 180–182.

8. Sekcja turystyczna P.T.T. // Wierchy. Rocznik poświęcony górom i góralszczyźnie. –Lwów : Księgarnia wydawnicza H. Altenberga, 1923. – S. 276.

9. Jędrzejczyk, K.–J. Polskie Towarzystwo Krajoznawcze (1906–1950) : zarys dziejów / K.–J. Jędrzejczyk. – Włocławek: Wydawnictwo Państwowej Wyższej Szkoly Zawodowej, 2006. – 151 s.

10. Twarog, J.–B. Polskie Towarzystwo Krajoznawcze. Oddzialy 1908–1950 / J.–B. Twarog [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://khit.pttk.pl/index.php?co=tx_ptk_om. – Дата доступа : 19.01.2014.

11. Zprawy towarzystwa // Ziemia. – 1928. – №8. – S. 127.

12. Lewan, M. Zarys dziejow turystyki w Polsce / M. Lewan. – Kraków : Wydaw. «Proksenia», 2004. – 106 s.

13. Informator turystyczny. – Warszawa : Nakladem Związku Polskich Towarzystw Turystycznych w Polsce, 1932. – 265 s.

14. Pawlrkowski, J. Przegląd turystyczny / J. Pawlrkowski // Wierchy. Rocznik poświęcony górom i góralszczyźnie. – Lwów : Księgarnia wydawnicza H. Altenberga, 1926. – S. 196.

15. Kolejowo–autobusowe bezpośrednie bilety uzlrowisk // Jedziemy. – 1939. – №17. – S. 1.

16. Z turystyki // Ziemia. – 1929. – №1. – S. 12–14.

17. Orłowicz, M. Zjazd towarzystw turystycznych w Warszawie / M. Orłowicz // Ziemia. – 1927. – №10. – S. 158–159.

18. Konferecja w sprawie wycieczek po Polsce // Ziemia. – 1929. – №7. – S. 107–108.

19. Likwidacja Związku Pol. Towarzystw Turystycznych // Wierchy. Rocznik poświęcony górom i góralszczyźnie. – Kraków: Nakladem Polskiego Tow. Tatrańskiego, 1938. – S. 196.

20. Sprawozdanie z działalności Związku Polskich Towarzystw Turystycznych za rok 1930. – Warszawa, 1931. – 121 s.

21. Kronika turystyczna // Wiadaniści Z.T.K. – 1934. – №2. – S. 9–10.

22. Laskiewicz, H. Robotnicze Towarzystwo Turystyczne (1934–1939) / H. Laskiewicz // Ziemia. – 1979. – №2. – S. 58–62.

23. Dyboski, R. Krajoznawstwo a wychowanie Państwowe / R. Dyboski // Ziemia. – 1936. – №6. – S. 150–152.

24. Z życia okręgow i oddziałow P.T.K. // Ziemia. – 1932. – №4–5. – S. 155.

25. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespol 88/3 Zbior zespołów szczątkowzch. Towarzystwo Opieki nad Zabytkami Przeszłości w Warszawie. – Sygn. 7. Protokóły walnych zgramadzeń Towarzystwa, 28 s.

26. Studium Turyzmu U.J. // Wierchy. Rocznik poświęcony górom i góralszczyźnie. – Kraków : Nakladem Polskiego Tow. Tatrańskiego, 1936. – S. 210.

27. Sprawozdanie z działalności Studium Turyzmu Uniwersitetu Jagiellońskiego za okres 1.V.1936–30.IX.1937. – Kraków : UJ, 1937. – 32 s.

28. Towarzystwo Przyjaciół Nauk w Wilnie // Kujawsko–Pomorska Digital Library [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа : http://kpbc.umk.pl/dlibra/. – Дата доступа : 19.01.2014.

## THE ACTIVITIES OF PUBLIC ORGANISATIONS AND ASSOCIATIONS IN THE TRAVEL AND TOURISM INDUSTRY IN WESTERN BELARUS IN 1921–1939

***U. GANSKI***

***Summary***

The article considers the activities of the various organizations and associations that have influenced the development of travel and tourism on the territory of Western Belarus in the interwar period; their classification on the regional and national; evaluates their contribution to the development of tourism in Belarusian provinces of Poland on the basis of analysis of the materials of the Polish archives and periodicals of the relevant period.

© Ганскі У.А.

*Поступила в редакцию 28 января 2014г.*



ПолесГУ